Эмануіл ІОФЕ

# АЛЯКСАНДР МЯСНІКОЎ і яго роля ў гісторыі Беларусі

*Да гэтага часу гісторыкі спрачаюцца аб ролі Аляксандра Мяснікова ў гісторыі Беларусі. Адны даследчыкі адзначаюць, што ён у канцы 1918 — пачатку 1919 г. з'яўляўся не зусім паслядоўным выканаўцам волі наркама па справах нацыянальнасцяў РСФСР Іосіфа Сталіна, іншыя падкрэсліваюць яго вызначальную ролю ў стварэнні беларускай дзяржавы на савецкай аснове. Хто ж з гісторыкаў мае рацыю? Адказаць на гэтае пытанне нам дапаможа разгляд разнастайных крыніц і публікацый.*

Упершыню Аляксандр Мяснікоў апынуўся на беларускай зямлі ў лютым 1915 г., калі служыў пры штабе 3-га корпуса 10-й расійскай арміі. Усяго ж ён знаходзіўся на тэрыторыі Беларусі амаль два гады: у лютым — маі 1915 г., з красавіка 1917 па люты 1918 г., з канца снежня 1918 г. па красавік 1919 г., з мая да пачатку кастрычніка 1920 г. Яшчэ каля дзесяці месяцаў, у сакавіку — снежні 1918 г., А.Мяснікоў быў у Смаленску, дзе ўдзельнічаў у падрыхтоўцы стварэння ССРБ і яе абвяшчэнні.

Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў нарадзіўся 9 лютага 1886 г. у горадзе Нахічавань-на-Доне (цяпер частка Пралетарскага раёна Растова-на-Доне) у мяшчанскай сям'і армянскага паходжання. Яго сапраўднае прозвішча — Мяснікьян, літаратурны псеўданім — Ал.Мартуні, партыйныя мянушкі — Алёша, Бальшавік. Аляксандр Мяснікоў рана страціў бацьку. З 13 гадоў ён зарабляў на жыццё ўрокамі, у 15 гадоў меў дачыненне да нелегальных і паўлегальных гурткоў рэвалюцыйнага характару. У 1906 г. Мяснікоў скончыў гімназічныя класы Лазараўскага інстытута ў Маскве і паступіў на юрыдычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Аднак у снежні таго ж года быў арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць і высланы з Масквы ў Баку, дзе ўключыўся ў актыўную рэвалюцыйную працу. У 1908—1911 гг. Мяснікоў зноў у Маскве. У маі 1911 г. ён скончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. У верасні 1911 г. А.Мяснікова прызываюць у войска, з якога ён дэмабілізуецца праз год у званні прапаршчыка. У 1912—1914 гг. Аляксандр Фёдаравіч працаваў памочнікам прысяжнага паверанага ў Маскве. У 1914 г. у сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны яго зноў прызываюць у войска. Ён служыць начальнікам вучэбнай каманды 121-га запаснога пяхотнага палка, што кватараваў у Дарагабужы, на Смаленшчыне. У 1915—1916 гг. Мяснікоў праводзіць падпольную агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод салдат на Заходнім фронце. У маі — чэрвені 1918 г. — камандуючы Прыволжскім фронтам Чырвонай арміі, які ваяваў супраць Чэхаславацкага корпуса. З красавіка 1919 г. працаваў ваенным арганізатарам Маскоўскага гарадскога камітэта РКП(б). 25 верасня



***ІОФЕ Эмануіл Рыгоравіч.***

*Прафесар кафедры паліталогіі і права Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1939 г. У 1961 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. Працаваў настаўнікам, выкладчыкам гісторыі, быў прарэктарам Яўрэйскага народнага ўніверсітэта (1995–1998 гг.), прафесарам кафедр эканомікі, сацыяльных навук і іўдаікі Міжнароднага гуманітарнага інстытута БДУ (1999–2004 гг.). Член Беларускага саюза журналістаў. Аўтар больш за 1800 навуковых, навукова-папулярных і метадычных публікацый па пытаннях гісторыі і гістарыяграфіі Беларусі, гісторыі культуры яўрэяў Беларусі, аб знакамітых ураджэнцах Беларусі, у тым ліку кніг "Советские военачальники на белорусской земле" (Мн., 1988), "Страницы истории евреев Беларуси. Краткий научно-популярный очерк" (Мн., 1996), "Иностранные евреи в Тростенецком лагере смерти" (Мн., 2000), "Белорусские евреи: трагедия и героизм" (Смоленск, 2003), "История Беларуси XVIII—XX веков. Учеб.-метод. пособие" (Мн., 2003), "Когда и зачем Гитлер и другие высшие чины нацистской Германии приезжали в СССР?" (М., 2010).*



*Аляксандр Мяснікоў.*

1919 г. быў кантужаны пры выбуху ў зале пасяджэнняў Маскоўскага камітэта РКП(б), арганізаваным Усерасійскім паўстанцкім камітэтам рэвалюцыйных партызан "Анархісты падполля". 27 верасня 1919 г. абіраецца адказным сакратаром Маскоўскага камітэта РКП(б). З мая 1921 г. па люты 1922 г. — старшыня Савета народных камісараў і наркам па ваенных справах Армянскай ССР, у сакавіку — снежні 1922 г. — старшыня Саюзнага Савета ЗСФСР. У 1922—1925 гг. А.Мяснікоў быў першым сакратаром Закаўказскага краявога камітэта РКП(б). Адначасова ў 1923—1925 гг. з'яўляўся членам Рэўваенсавета СССР, кандыдатам у члены ЦК РКП (б), членам Прэзідыума ЦВК СССР. 22 сакавіка 1925 г. Аляксандр Мяснікоў загінуў у авіяцыйнай катастрофе каля Тбілісі.

Вось кароткія звесткі пра А.Ф.Мяснікова, за выключэннем беларускага этапа яго жыцця і дзейнасці. А цяпер больш падрабязна разгледзім гэтыя старонкі яго біяграфіі. Бясспрэчна, што А.Ф.Мяснікоў адыграў значную ролю ва ўсталяванні і ўмацаванні ў Беларусі і на Заходнім фронце савецкай улады, у станаўленні беларускай савецкай дзяржаўнасці, у стварэнні Камуністычнай партыі Беларусі.

Так, 5 красавіка 1917 г. салдаты 121-га запаснога пяхотнага палка абралі Аляксандра Фёдаравіча дэлегатам Першага з'езда ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту, які мусіў прайсці ў Мінску 7—17 красавіка 1917 г. 6 красавіка ён прыбывае ў Мінск. На з'ездзе яго абралі членам Выканаўчага камітэта Заходняга фронту. Так пачынаецца беларускі этап жыцця А.Мяснікова.

веня 1917 г. на агульным сходзе мясцовых сацыял-дэмакратаў бальшавікі афіцыйна заявілі пра свой выхад з аб'яднанай арганізацыі. У той жа дзень А.Мяснікоў узначаліў Часовы камітэт Мінскай арганізацыі РСДРП (б), а 17 ліпеня 1917 г. быў абраны старшынёй Пастаяннага камітэта Мінскай арганізацыі РСДРП (б).

У ліпені 1917 г. А.Мяснікоў разам з іншым лідарам мінскіх бальшавікоў М.Фрунзе стаў арганізатарам выдання мясцовай бальшавіцкай газеты "Звезда". На той час ні сродкаў, ні паперы, ні друкарні для гэтых мэтаў не было. Для збору грошай была арганізаваная латарэя сярод салдат і рабочых. Аднак сабраных сродкаў было недастаткова. І тады кіраўнікі мінскіх бальшавікоў вырашылі звярнуцца ў Цэнтральны камітэт РСДРП(б). Вось як А.Мяснікоў успамінаў пра гэты эпізод: "*...Собрав последние копейки, снарядили одного из товарищей в Питер, в ЦК, с челобитной, ссудить нам некоторую сумму денег для начала задуманного литературного предприятия. Надеялись, а вместе с тем думали, что навряд ли ЦК примет во внимание просьбу молодой неизвестной организации. Посланец вернулся с 2 тысячами рублей. Была же радость на нашей улице. На эти деньги мы могли иметь целых шесть номеров своей ежедневной газеты*"[1]. Першы нумар газеты "Звезда" выйшаў 27 ліпеня 1917 г. А.Мяснікоў успамінаў, што газета "*рассыпалась по Минску, краю и фронту в 3000 лучах*". Падкрэслім, што першым рэдактарам "Звезды" стаў менавіта А.Мяснікоў[2]. У першым яе нумары пад псеўданімам Ал.Мартуні быў змешчаны артыкул Аляксандра Фёдаравіча "Большевики", які знаёміў чытачоў з праграмнымі палажэннямі РСДРП (б).

1—3 верасня 1917 г. А.Мяснікоў быў старшынёй абласной і франтавой нарады РСДРП(б), яго абралі ў абласное бюро РСДРП(б). 15—18 верасня ён кіраваў Першай Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыяй РСДРП(б), якая завяршыла афармленне абласной партыйнай арганізацыі і стварэнне адзінага абласнога партыйнага цэнтра — Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б). Аляксандра Фёдаравіча абралі яго старшынёй. У верасні ж ён узначаліў бальшавіцкую фракцыю ў Выканаўчым камітэце Заходняга фронту. 5—7 кастрычніка А.Мяснікоў кіруе Другой Надзвычайнай Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыяй РСДРП(б), што праходзіла пад знакам падрыхтоўкі сацыялістычнай рэвалюцыі. 18 кастрычніка 1917 г. пад старшынствам А.Мяснікова адбыўся першы пасля перавыбараў агульны сход Мінскага савета. Бальшавіцкая фракцыя атрымала ў но-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы